*Наталля Петухова*

# ПЕДАГАГІЧНЫЯ ЎМОВЫ ФАРМІРАВАННЯ ЭСТЭТЫЧНАГА ЎСПРЫМАННЯ ПРЫРОДЫ ЎДЗЕЛЬНІКАМІ ДЗІЦЯЧАГА ФАЛЬКЛОРНАГА КАЛЕКТЫВУ

Апошнім часам педагогі дыскутуюць пытанне пра неабходнасць развіцця ў асобы здольнасцяў да эстэтычнага ўспрымання. Выснова – толькі чалавек з эстэтычнымі пачуццямі, які мае здольнасць да рэфлексіі, эмпатыі, праяўляе адказнасць за захаванне прыроды (А.Я. Герд, Д.М. Кайгародаў, Н.У. Самерсава, І.Ф. Смальянінаў, М.В. Шаптухоўскі і інш.). У любым выхаваўчым працэсе важна мець магчымасці фарміравання ў навучэнцаў трывалай эколага-эстэтычнай пазіцыі. Спрыяльнай глебай для фарміравання ў дзяцей эстэтычнага ўспрымання прыроды з'яўляецца фальклор. Мэта дадзенага артыкула заключаецца ў спробе пошуку магчымасцяў эфектыўнага выхоўвання дзяцей у фальклорным калектыве, садзеянню якаснага засваення імі прыродаахоўчай эстэтыкі, умацавання патрэбы ў стварэнні прыгажосці не толькі ў мастацкай дзейнасці, але і ў побыце.

На мяжы XX–XXI стагоддзяў на Беларусі існуе шмат дзіцячых фальклорных калектываў, дзейнасць якіх пачынае разглядацца даследчыкамі як моцны рух наперад у галіне этнапедагогікі. Але, распаўсюджанне калектываў выклікала шэраг педагагічных праблем, ігнараванне якіх прыводзіць да павярхоўных адносінаў выхаванцаў да традыцыйнай культуры і, як вынік, частковай дысфункцыянальнасці педагагічнага працэсу.

У 1970–1980-я гады аматарскія фальклорныя калектывы ў большасці арыентаваліся на сферу выканальніцкага мастацтва, на тыя філарманічныя хары і ансамблі, якія дасягнулі пэўных вышынь на прафесійнай сцэне. У рэпертуар аматарскіх калектываў і іх удзельнікаў трапляюць песні, танцы, інструментальная музыка і г.д., якія засвойваюцца тым жа шляхам, што і класічная музыка – праз ноты. Аднак, згодна з Л.Л. Ражковай «пісьмовая культура, у межах якой працякае дзейнасць такіх калектываў, нараджае сваю мову і выпрацоўвае сваю сістэму яе засваення, пры якой выхаваўчы патэнцыял фальклору не можа рэалізавацца» [5, с. 73]. Шэраг педагогаў-даследчыкаў (І.М. Грамовіч, Т.А. Пладунова, Л.Л. Ражкова і інш.) прыйшлі да высновы, што выкарыстанне ў якасці дыдактычных арыенціраў аўтэнтычнага фальклору можа прынесці больш плёну, чым арыентацыя на прафесійных выканаўцаў. Народнае мастацтва дагэтуль захавала жыватворную моц дзякуючы вуснаму шляху перадачы традыцыі. Навучанне фальклору праз слыхавое ўспрыманне, узнаўленне па памяці слыхавых уяўленняў можна лічыць прыярытэтным метадам навучання. Ён накіроўвае на пераймание музычных узораў з аўдыё-, відэазапісаў (праз аналіз музычнай мовы і падпяванне), што гарантуе дакладнае ўзнаўленне інтанацыйна-меладычных асаблівасцяў народна-песеннага фальклору, яго этнафанічнай спецыфікі.

Другая праблема дзейнасці аматарскага фальклорнага калектыву – гэта сцэнічныя спевы. Фальклор не разлічаны на выкананне з эстрады, бо ён менш за ўсё можа разглядацца як перадача інфармацыі пасіўнаму слухачу. Выканання песні ў традыцыі – гэта «спевы для сябе». Такія спевы прадугледжваюць своеасаблівую манеру выканання, у якой не магчыма выкарыстанне «канцэртных» правілаў. Гэта «школа» традыцыі патрабуе ашчадных адносінаў і выкарыстання ў педагагічнай практыцы фальклорнага калектыву [3, с. 10].

Аднак акалічнасці дзейнасці аматарскага фальклорнага калектыву спрыяюць актыўнай канцэртнай дзейнасці, і, на наш погляд, трэба ўлічваць, што трапляючы на сцэну народная творчасць істотна трансфармуецца – губляе адны рысы і набывае іншыя. Жывое бытаванне фальклору звязваецца з пэўным асяроддзем (Жніво – на полі, Купалле – ноччу, на ўлонні квітнеючай прыроды), якое патрабуе спецыяльнай мастацкай рэканструкцыі. Больш таго, наяўнасць аўдыторыі на сучасных канцэртах істотна адрозніваецца ад цеснага вясковага кола вострa рэагуючых і суперажываючых сатворцаў-саўдзельнікаў. Паводле Б.М. Пуцілава, пры выкананні абраду не патрэбна аўдыторыя, бо фальклор накіраваны не на вонкавы бок, а ў фальклорнае атачэнне [4, с. 10]. Дзеля фарміравання такога асяродку патрэбна арганізацыя фальклорна-этнаграфічных фэстаў-форумаў рознага ўзроўню з мэтай правядзення імпрэз, на якіх фальклорныя калектывы маюць магчымасць выступаць як выканаўцы-саўдзельнікі свята.

Сёння не магчыма не ўлічваць, што фальклор часцей уваходзіць у наша жыццё праз адаптацыйныя шляхі, аднак, па-магчымасці, мы ўсё ж такі лічым патрэбным выкарыстоўваць у выхаваўчам працэсе жывую аўтэнтычную традыцыю. Таму значнай умовай нашай працы па

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

фарміраванні ў падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды з'яўляецца ***выкарыстане ў педагагічным працэсе эстэтыкі жывога аўтэнтычнага бытавання фальклору.***

Трэцяя праблема дзейнасці дзіцячых фальклорных калектываў – выкарыстанне фальклору іншых краін і псеўдатрадыцыйных персанажаў у абрадах. Напрыклад, дагэтуль кіраўнікі дзіцячых фальклорных калектываў выкарыстоўваюць у якасці рэпертуару рускія, польскія і ўкраінскія народныя песні. Акрамя таго – устаўляюць у каляндарныя абрады персанажы, прысутнасць якіх на свяце «ушчэнт разбурае беларускую народную традыцыю» [1, с. 10]: Бабу-Ягу, паяцаў, Ямелю, Нептуна і інш. Гэтага рабіць нельга, бо такія «некампетэнтныя навеўвядзенні» не здольныя аказаць чакаемага этнакультурнавыхаваўчага ўздзеяння на дзіця.

Л.М. Гумілёў падкрэсліваў, што традыцыйная культура заўсёды прыродна пэўная, бо адлюстроўвае жыццё пэўнай супольнасці людзей у геаграфічна адпаведным прыродным ландшафце. Такім чынам, традыцыйная культура ўлічвае прыроднагаспадарчыя акалічнасці і асаблівасці эстэтычнага ўспрымання прыроды кожнай мясцовасці. У артыкуле «Строгі крытэрый агульначалавечай этыкі» Генеральны дырэктар ЮНЭСКА Федэрыка Майор піша: «Падобна таму як усё мноства відаў і форм жыцця, што складаюць біяразнастайнасць Зямлі, узнікла ў працэсе адаптацыі да розных геаграфічных і кліматычных умоў, так і прыстасаванасць homa sapiens – адзінага віда, які можа выкарыстоўваць любую экалагічную нішу, знаходзіць выражэнне ў культурнай разнастайнасці чалавецтва. Такім чынам, для вільготных тропікаў, у адрозненне ад тундры ці засушлівых зон умеранага поясу, характэрны не толькі іншы раслінны і жывёльны свет, але і іншыя асаблівасці культуры, носьбітамі якой з'яўляюцца мясцовыя тубыльцы. Падобна таму, як прырода стварае разнастайнасць відаў, прыстасаваных да адпаведнага навакольнага асяроддзя, так і чалавецтва нараджае розныя культуры, адпаведныя мясцовым асаблівасцям» [2, с. 6]. Таму вельмі важнай умовай эфектыўнага фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды ўдзельнікамі аматарскага фальклорнага калектыву з'яўляецца ***ўмова геаграфічнай канкрэтнасці вывучаемай традыцыі.***

Чацвёртай праблемай з'яўляюцца несвядомыя адносіны да фальклору, якія зводзяцца да пераўтварэння яго ў забаву. Акцэнты робяцца не на рэальную, а на «выдуманую» культуру. У інтарэсах эстрады спрашчаюць касцюм, абрадавыя дзеянні – да поўнай абсурднасці, аднак з захаваннем відовішчнасці. «Няведанне сэнсу і значэння свята прыводзіць да таго, што ўдзельнікі фальклорных калектываў, якія займаюцца ўвасабленнем рытуальных і гульнявых дзей, не могуць гэтыя дзеі якасна ўвасобіць як выканаўцы, у выніку свята пераўтвараецца ў падробку» [1, с. 10].

Такім чынам, яшчэ адной педагагічнай умовай у абраным намі выхаваўчым напрамку ўяўляецца ***зрабіць адносіны дзяцей да фальклору свядомымі***, пазнаёміць іх з асаблівасцямі прыроднага светапогляду беларусаў, з яго эстэтычным патэнцыялам.

Аднак, дзеля развіцця эстэтычнага ўспрымання прыроды неабходны не толькі працэс пазнання, але і эмацыйна, творчыя стасункі з жывой прыродай. Такім чынам, трэба сістэматычна і мэтанакіравана ўзбагачаць эмацыянальна-пачуццёвыя ўражанні дзяцей праз ***непасрэднае ўзаемадзеянне з рэальнымі аб'ектамі і з'явамі прыроды.***

Кожная сустрэча з прыродай не толькі дапамагае дзецям убачыць прыгажосць аб'ектаў і з'яў навакольнага асяроддзя, але і дапамагае адчуць усё хараство роднага краю. Непасрэднае ўспрыняцце прыгажосці прыроды, асабліва ў працэсе творчай дзейнасці, паглыбляе эстэтычны вопыт выхаванцаў. У дзейнасці дзіцячага фальклорнага калектыву найбольш істотны выхаваўчы плён могуць прынесці абрадавыя святы ў натуральным прыродным асяроддзі, што ўводзяць дзяцей у стан, праз які магчыма карэкціраваць паводзіны асобы, засвоіць эстэтычныя і грамадска адаптаваныя стэрэатыпы ўзаемадзеяння з прыродай. Такім чынам у межах дзейнасці па этнакультурным выхаванні мы імкнемся сфарміраваць эстэтыку адносінаў да прыроды, якая скіроўвае на прыродаахоўную дзейнасць.

Спіс літаратуры:


1. Гуд, П.А. Беларускае купалле: кампазіцыя і семантыка абрадавых дзей. – 2-е выд. / П.А. Гуд. – Мінск : БДУКМ, 2006. – 137 с.
2. Майор, Ф. (Генеральный директор ЮНЕСКО). Строгий критерий общечеловеческой этики. Федерико Майор говорит о роли культуры в достижении устойчивого развития / Ф.Майор // Наша планета : программа ООН по окружающей среде (ЮНЕП) : журнал по проблемам устойчивого развития. – М. : ЮНЕПКОМ, 1996. – Т. 8, № 2. – С. 4 – 6. – (Культура, духовные ценности и окружающая среда).
3. Путилов, Б.Н. Фольклор и художественная самодеятельность / Б.Н. Путилов. – Л. : Наука, 1968. – 135 с.
4. Путилов, Б.Н. К морфологии фольклорной культуры / Б.Н. Путилов // Искусство устной традиции. Историческая морфология : К 60-летію І.І. Земцовского : сб.ст. / отв. ред. и сост. Н.Ю. Альмеева.– СПб. : Рос. ин-т истории искусств, 2002. – С. 8–11.
5. Ражкова, Л.Л., Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскіх мастацкіх калектывах : дыс. … канд. пед. навук : 13.00.05 / Л.Л. Ражкова.– Мінск, 2007. – 145 с .




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ